***В. І. Саітава,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры бібліятэчна-*
*інфармацыйнай дзейнасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# АДУКАЦЫЙНЫЯ ІНФАРМАЦЫЙНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ РЭСУРСЫ Ў СТРУКТУРЫ АБСЛУГОЎВАННЯ КАРЫСТАЛЬНІКАЎ АБЛАСНЫХ УНІВЕРСАЛЬНЫХ НАВУКОВЫХ БІБЛІЯТЭК

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У абласных універсальных навуковых бібліятэках (АУБ) інфармацыйнае забеспячэнне сферы адукацыі адносіцца да важных напрамкаў дзейнасці. Пазіцыю АУБ у сферы адукацыі вызначаюць іх універсальныя рэсурсы, усталяваныя трывалыя сувязі з навучальнымі ўстановамі рэгіёнаў, кваліфікаваны персанал, які валодае інфармацыйнымі і педагагічнымі тэхналогіямі. Безумоўна, дзейнасць абласных бібліятэк суадносіцца з функцыянаваннем спецыяльных бібліятэк устаноў адукацыі на тэрыторыі рэгіёнаў. Спецыфіка АУБ у тым, што іх бібліяграфічныя рэсурсы маюць універсальны характар і прызначаюцца для задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей розных карыстальніцкіх груп, у т. л. патрэбнасцей суб’ектаў сферы адукацыі. Улічваючы адзначанае, у артыкуле разглядаецца функцыянал як універсальных бібліяграфічных рэсурсаў, што выкарыстоўваюцца для задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей сацыяльных і прафесіянальных груп у сферы адукацыі, так і рэсурсаў мэтаскіравана створаных для іх забеспячэння.

Буйнейшымі ўніверсальнымі бібліяграфічнымі рэсурсамі з’яўляюцца электронныя каталогі, якія ахопліваюць пэўны склад баз даных: ад 5 (Гомельская АБ) да 14 БД (Брэсцкая АБ). Базы даных, якія адлюстроўваюць кнігі, перыёдыку, аўтарэфераты дысертацый, артыкулы, шырока выкарыстоўваюцца ў вучэбных мэтах для дасягнення навукова-даследчых задач, якія вырашаюць студэнты і выкладчыкі. Выданні вучэбнага і даведачнага характару адлюстраваны ў БД «Нямецкая літаратура» (ЭК Віцебскай АБ), БД «Каталог Американа» (ЭК Мінскай АБ) і інш.

Унікальнымі рэсурсамі з'яўляюцца БД «Краязнаўства» электронных каталогаў, паўнатэкставыя і камбініраваныя БД, якія прадстаўляюць універсальны па змесце і дынамічны паток рэгіёназнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі. Гэтыя метаданыя адыгрываюць важную ролю для інфармацыйнага забеспячэння шматлікіх рэгіёназнаўчых дысцыплін, якія выкладаюцца ва ўніверсітэтах і выкарыстоўваюцца ў пошукава-даследчай дзейнасці аматарскіх краязнаўчых суполак у школах і іншых навучальных установах. Да краязнаўчых БД найбольш актыўна звяртаюцца студэнты і іншыя суб'екты адукацыйнага працэсу. Такую выснову зрабілі ў Магілёўскай АБ, аналізуючы выкарыстанне паўнатэкставай БД «Край мой – Магілёўшчына».

ЭК абласных бібліятэк прадстаўлены ў інтэрнэце і на бягучы момант дазваляюць карыстальнікам атрымаць элементарны сэрвіс: просты і пашыраны пошукі. Забяспечваючы пошукавую функцыю, электронныя каталогі недастаткова рэалізуюць функцыю бібліяграфічнага інфармавання аб новых дакументах. Таму важна, што АУБ працягваюць стварэнне БД, бюлетэняў і спісаў новых паступленняў кніг і перыёдыкі («Сводный перечень периодических изданий Брестской областной библиотеки им. М. Горького», «Бюллетень новых поступлений» Віцебскай АБ і інш.).

Задачы пашырэння інфармацыйнага забеспячэння сферы адукацыі вырашаюцца і шляхам выкарыстання рэсурсаў ВЧЗ Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Пры гэтым улічваецца, што доступ да БД і электронных бібліятэк сусветных вытворцаў, арыентаваных на адукацыю, забяспечваюць бібліятэкі УВА. У 2017 г. АУБ падпісаліся на ЭБС «Университетская библиотека онлайн» (Брэсцкая, Гомельская, Гродзенская, Мінская АБ), «Интегрум» (Віцебская, Магілёўская АБ). Найбольш папулярная сярод АУБ «Университетская библиотека онлайн» ахоплівае звыш 70 тыс. электронных і аўдыякніг, вучэбнай літаратуры для УВА, сярэдніх спецыяльных вучэбных устаноў і школ, навуковыя і даведачныя выданні, навуковую перыёдыку. Кожнае выданне цалкам адпавядае патрабаванням да бібліяграфічнага афармлення: змешчаны вокладка, бібліяграфічнае апісанне, анатацыя. Магчыма адзначыць, што праведзенае параўнанне падпіскі АУБ і бібліятэк універсітэтаў, праведзенае на прыкладзе Брэсцкай вобласці, паказвае, што ЭБС

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Университетская библиотека онлайн» прадстаўляецца ў абласной бібліятэцы, бібліятэках Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна і Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, але яе няма ў складзе пакета БД, падпісаных для Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага і Палескага дзяржаўнага ўніверсітэтаў. Улічваючы, што ў АУБ падпіска на друкаваныя вучэбныя выданні для розных адукацыйных устаноў мае мінімальныя паказчыкі, падпіска на ЭІР ВЧЗ з'яўляецца актуальнай формай забеспячэння даступнасці бібліяграфічных метаданых, фіксаваных навуковых ведаў і вучэбных матэрыялаў для суб'ектаў адукацыі.

Шырока запатрабаваны ў адукацыйнай дзейнасці інфармацыйныя прававыя рэсурсы, сканцэнтраваныя ў ПЦПІ абласных бібліятэк. Кантэкстныя метаданыя электронных рэсурсаў ПЦПІ і бібліяграфічная прадукцыя па актуальных пытаннях права, унутранай палітыцы ў краіне, створаная ў саміх АУБ, выкарыстоўваюцца ў мэтах бібліяграфічнага абслугоўвання студэнтаў, навучэнцаў і выкладчыкаў профільных спецыяльнасцей.

У абласных бібліятэках ствараецца значная колькасць бібліяграфічных прадуктаў розных тыпаў і відаў як друкаваных, так і электронных, якія мэтаскіравана адрасаваны суб'ектам сферы адукацыі. Гэта бібліяграфічныя спісы, агляды, паказальнікі, віртуальныя выставы, мультымедыйныя рэсурсы актуальнай педагагічнай тэматыкі. Бібліяграфічныя агляды стабільна суправаджаюць разнастайныя мерапрыемствы АУБ адукацыйнага характару. Так, агляды лепшых кніг гучаць на інтэрактыўных уроках «Мастерская знаний» для дзяцей сярэдняга ўзросту ў аддзеле літаратуры для дзяцей і юнацтва Брэсцкай АБ. Для правядзення ўрокаў прыцягваюцца настаўнікі-прадметнікі. Бібліяграфічныя агляды праводзяцца супрацоўнікамі Брэсцкай АБ на ўроках паглыбленага вывучэння гісторыі (СШ 18) і беларускай літаратуры (СШ № 37), на занятках для груп студэнтаў філалагічнага і юрыдычнага факультэтаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Віртуальныя выставы ахопліваюць разнастайную тэматыку, у якой зацікаўлены суб'екты адукацыі, найбольш запатрабаваныя – рэгіянальная гісторыя, выдатныя асобы, замежныя мовы. Укладкі вучэбных, даведачных і іншых выданняў і рэкамендацыйныя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

анатацыі арыентуюць карыстальнікаў пры азнаямленні з гэтымі рэсурсамі (напрыклад, у Віцебскай АБ у 2017 г. створаны на выставы «Лингвострановедение», «Изучаем китайский»).

Рэсурсы краязнаўчай тэматыкі, незаменныя для вывучэння рэгіянальнай гісторыі і іншых рэгіёназнаўчых дысцыплін, выкарыстоўваюцца школьнікамі і студэнтамі, настаўнікамі, выкладчыкамі, выхавацелямі. Яркім прыкладам можа быць электронны бібліяграфічны паказальнік «Брестский мир: 95 лет со дня подписания» (2013, серыя «Исторические символы Бреста»). На падставе паказальніка рэалізавана ЭБД пад такой жа назвай. ЭБД ахоплівае публікацыі дакументаў знешняй палітыкі, асобныя выданні, главы і раздзелы з кніг, часопісныя і газетныя артыкулы з айчынных і замежных крыніц, ілюстрацыйныя матэрыялы, матэрыялы аб удзельніках дэлегацый на перамовах і інш. Разам з НББ і замежнымі партнёрамі Брэсцкая АБ удзельнічала ў стварэнні электронных рэсурсаў «Юзаф Крашэўскі» і «Сапегіяна: кнігазбор роду Сапегаў». У іх складзе змешчаны грунтоўныя бібліяграфічныя матэрыялы аб выбітных прадстаўніках знакамітых родаў Берасцейшчыны. У абласных бібліятэках надаецца значная ўвага падрыхтоўцы біябібліяграфічнай прадукцыі, прысвечанай пісьменнікам, гістарычным дзеячам і іншым выдатным асобам. Такія рэсурсы садзейнічаюць вывучэнню персанаграфічных аспектаў вучэбных дысцыплін («Алесь Каско» Брэсцкай АБ, «Эліза Ажэшка» Гродзенскай АБ і інш.).

З дапамогай бібліяграфічных рэсурсаў АБ вядуць прафарыентацыйную дзейнасць сярод юнацтва. Так, бібліяграфічныя спісы прафарыентацыйнага характару выйшлі ў серыі «Профессии мира права» Брэсцкай АБ, віртуальныя выстаўкі «Для вас, абитуриенты!» створаны ў Магілёўскай АБ.

Бібліяграфічныя матэрыялы ахопліваюць і пытанні выхавання моладзі. Напрыклад, рэкамендацыйныя бібліяграфічныя спіскі складаюцца для распрацоўкі тэматыкі лекторыя «Ориентир» для юнацтва Магілёўскай АБ.

Значная колькасць бібліяграфічных дапаможнікаў даступна карыстальнікам на сайтах. Функцыянуюць віртуальныя даведачныя службы. Адукацыйны напрамак АУБ развіваюць і ў сацыяльных сетках. Унікальны праект – бясплатныя курсы «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэалізаваны кафедрай гісторыі Беларусі ВДУ імя П. М. Машэрава, Віцебскай абласной бібліятэкай імя У. І. Леніна сумесна з клубам гістарычнай рэканструкцыі «Vargentorn» і Віцебскім гарадскім парталам. Курсы праходзяць на базе Віцебскай АБ двойчы ў месяц для ўсіх жадаючых. Удзельнікам прапанаваны тэматычныя лекцыі, кансультацыі запрошаных экспертаў, фота- і відэаматэрыялы, дыскусіі па асноўных этапах гісторыі горада. Да кожнай з 20 тэм лекцый дадаюцца спісы рэкамендаванай літаратуры. Матэрыялы лекцый і бібліяграфічныя спісы размешчаны на старонцы бібліятэкі «В Контакте».

Акрамя стварэння ІР, комплекс адукацыйных сродкаў АУБ на сучасным этапе ахоплівае правядзенне заняткаў і кансультацый у межах фарміравання інфармацыйнай культуры карыстальнікаў на базе АУБ і дыстанцыйна. Заняткі праходзяць у форме ўрокаў, экскурсій, майстэрняў, курсаў, вебінараў і інш., ахопліваюць настаўнікаў, выкладчыкаў, студэнтаў, вучняў. Бібліятэкі арганізуюць і праводзяць вучэбныя заняткі для мэтавага кантынгенту, прафіліруючы іх формы і змест для карыстальніцкай групы. Добры вопыт такой работы назапашаны ва ўсіх абласных бібліятэках. Так, бібліяграфічная інфармацыя, карысная для настаўнікаў англійскай мовы, пачала даводзіцца праз вебінары (аддзел літаратуры на замежных мовах Брэсцкай АБ). Аддзел абслугоўвання школьнікаў малодшых класаў Магілёўскай АБ у 2016 г. распачаў праект па інтэграцыі адукацыйных устаноў і бібліятэкі ў фарміраванне інфармацыйнай культуры навучэнцаў г. Магілёва «Падлетак у інфармацыйным асяроддзі» (2016–2019). У межах праекта прыярэты аддадзены інфармацыйна-бібліяграфічнаму абслугоўванню і самаабслугоўванню карыстальнікаў у дапамогу вучэбнай, навуковай і прафесійнай педагагічнай дзейнасці. Штомесяц арганізуюцца бібліятэчна-бібліяграфічныя ўрокі для вучняў школ, ліцэяў і студэнтаў УВА [2]. Традыцыйна прадстаўляюць бібліяграфічныя рэсурсы і паслугі АУБ і на мерапрыемствах, прысвечаных дням і тыдням ведаў, дням адчыненых дзвярэй і інш. Так, ПЦПІ Гомельскай АУБ традыцыйна праводзіць у верасні для студэнтаў юрыдычнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны і гуманітарна-эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту Тыдзень першакурсніка, дзе адбываецца знаёмства з рэсурсамі і паслугамі ПЦПІ [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падводзячы вынікі, можна адзначыць, што абласныя бібліятэкі вядуць бібліяграфічнае забеспячэнне таго ж кантынгенту, як і бібліятэкі навучальных установаў, арганізуючы выкарыстанне ў адукацыйных мэтах універсальных і мэтаскіравана створаных бібліяграфічных рэсурсаў. Шматлікасць бібліятэк навучальных установаў, якія функцыянуюць у рэгіянальнай прасторы разам з АУБ, не прыводзіць да дубліравання ў бібліяграфічным забеспячэнні і паслугах. Бібліяграфічныя рэсурсы абласных бібліятэк, у т. л. кантэнтныя метаданыя паўнатэкставых БД і электронных бібліятэк, не толькі рэальны, але і патэнцыяльна важнейшы сродак доступу да крыніц фіксаваных ведаў вялікага кантынгенту суб’ектаў адукацыйнага працэсу. Вывучэнне тэмы выявіла, што адным з кірункаў інфармацыйна-бібліяграфічнага забеспячэння адукацыі можа стаць актывізацыя ўзаемадзеяння з установамі сярэдняй спецыяльнай адукацыі, бібліятэкі якіх нярэдка не могуць прадставіць сучасных і дастатковых форм інфармацыйна-рэсурснага забеспячэння. Паглыбленне інтэграцыйных працэсаў на рэспубліканскім і рэгіянальных узроўнях па стварэнні ЗЭК бібліятэк Беларусі і электроннага рэсурсу нацыянальнай бібліяграфіі, рэалізацыя буйных праектаў у межах фарміравання інфармацыйнай культуры будуць садзейнічаць павышэнню значэння бібліяграфічных метаданых АУБ для інфармацыйнага забеспячэння сацыяльных і прафесійных груп, што задзейнічаны ў сферы адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

*1.* Публичные библиотеки Гомельщины в 2016 году : обзор деятельности / сост. Ю. А. Рачинский ; отдел библиотековедения ГОУБ. – Гомель, 2017. – С. 46.

*2.* Справаздача Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна за 2016 год [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://drive.google.com/file/d/0B-rbZfbTR4keWEJZYWl1QmdKOGs/view с. 21. – Дата доступу: 21.05.2017.